**Г.А.Быстроў**, *прафесар*

## ПАДРЫХТОЎКА СТУДЭНТАЎ ДА САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Сацыяльная функцыя музычнага мастацтва выразна выяўляецца ва ўплыве на розныя сферы жыцця людзей. Для таго каб асоба магла засвоіць мастацкія ідэі, патрабуюцца навуковае кіраванне культурным працэсам, вывучэнне механізмаў уздзеяння мастацкіх каштоўнасцей на духоўнае развіццё грамадства ў цэлым. Мастацтва заўсёды было пэласным і жывым адлюстраваннем стану грамадскага жыцця. Важнейшым механізмам мастацкага ўздзеяння на якасць падрыхтоўкі студэнтаў да будучай сацыяльна-культурнай дзейнасці з'яўляецца вучэбны рэпертуар. Ад яго мэтанакіраванасці залежаць не толькі фарміраванне творчай індывідуальнасці і выканаўчага майстэрства, маральна-эстэтычных якасцей студэнта, але і вырашэнне складаных шматпланавых задач, якія стаяць перад будучым прапагандыстам музыкі. Д.Б.Кабалеўскі падкрэсліваў, што твор, уключаны ў вучэбны рэпертуар, павінен



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

быць мастацкім і захапляльным, педагагічна мэтазгодным (г.зн. вучыць патрэбнаму і карыснаму). Адпаведнае месца ў вучэбным рэпертуары павінна займаць класічная спадчына беларускіх і замежных кампазітараў. Прынцыпова важным з'яўляецца і сам падыход да вывучэння творчасці асобных кампазітараў, які ажыццяўляецца з пазіцыі стылёвых асаблівасцей асноўных этапаў развіцця сусветнай музычнай культуры. Асаблівую ўвагу неабходна адвесці знаёмству студэнтаў з асноўнымі музычнымі жанрамі і формамі. Веды аб іх характэрных асаблівасцях яны павінны атрымаць пры вывучэнні найбольш тыповых узораў. У рэпертуары неабходна прадугледжваць знаёмства з мноствам творчых школ, напрамкаў, стылістычную разнастайнасць музычнага матэрыялу.

Усе недапрацоўкі ў фарміраванні ў студэнтаў мастацкага густу, уменняў адрозніваць добрае ад дрэннага, высакароднае і ўзвышанае ад нізкага і вульгарнага, уменняў бачыць і разумець у мастацтве не толькі прыгажосць, але і праўду жыцця будуць уплываць на іх будучую практычную дзейнасць. Цяперашні студэнт – гэта будучы выхавальнік удзельнікаў музычных калектываў і слухачоў.

А кожны чалавек, незалежна ад яго пасады і звання, калі ён складае канцэртную праграму, план работы дыскатэкі, арганізуе абмеркаванне музычных твораў, павінен быць выхавальнікам. Цяперашнія студэнты станууць у будучым тымі кіраўнікамі, якія сродкамі музыкі будуць выхоўваць мастацкі густ і духоўны свет чалавека, сцвярджаць у свядомасці асобы сацыяльна-культурныя каштоўнасці.

Выдатны піяніст і педагог Г.Г.Нейгауз адзначаў, што чым шырэй у студэнта кола інтарэсаў, тым вышэй у яго якасці музыканта. На жаль, не толькі студэнты, але і іншыя катэгорыі насельніцтва бачаць у музыцы толькі сродак забавы. У свой час Б.В.Асафьеў выступаў катэгарычна супраць распаўсюджвання музыкі, якая зніжае этычнае стаўленне да жыцця і адводзіць ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

высокіх ідэалаў мастацтва і заклікаў даць народу "шчодрай жменяй" жамчужыны музычнай класікі.

Наступленне забаўляльнай музыкі стварае сёння нямалыя цяжкасці ў сферы музычнага выхавання. Неабходна стварыць эмацыянальна-інтэлектуальную абарону для моладзі, навучыць маладых людзей адрозніваць сапраўды цудоўную музыку ад фальшывай, безгустоўнай.

Кампазітар, выканаўца, слухач, педагог складаюць адну сістэму. Усе чатыры звёны ў ёй раўназначныя. І ўсё ж музычную творчасць трэба выдзеліць як зыходную, якая ў значнай меры вызначае развіццё астатніх. Новыя напрамкі ў творчасці заўсёды выяўлялі новыя выканаўчыя стылі, новыя ідэі ў педагогіцы ўплывалі на эстэтычныя густы і ідэалы слухачоў.

Ад таго, як мы вызначым свае адносіны да творчасці, у значнай меры залежаць нашы адносіны да многіх іншых праблем. Таму важна рыхтаваць студэнта не толькі да выступлення на эстрадзе, але і да ўдзелу ў грамадскім жыцці.

Студэнты павінны добра разумець сацыяльную ролю мастацтва. Для гэтага неабходна абапірацца на моцны фундамент каштоўнасцей, створаных чалавецтвам. Д.Б.Кабалеўскі адзначаў, што выхаванне музыканта – самая складаная галіна музычнай педагогікі. Ад правільнага рашэння гэтага пытання залежаць і творчасць, і выканаўства, і адносіны да музыкі слухачоў, для якіх і будуць працаваць будучыя музычныя дзеячы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ